# У Маркавіцкім сельсавеце адкрываецца інтэрактыўная выстава народнага побыту

**Віктара Шыпкова добра ведаюць далёка за межамі Гомельскага раёна: малады чалавек дбайна збірае, захоўвае і рэстаўрыруе старажытныя рэчы, якія калісьці належылі ягоным родным і аднавяскоўцам. З цягам часу “геаграфія” даследаванняў аматара-краязнаўцы пашырылася, і зараз у ягонай “скарбонцы” – некалькі соцень экспанатаў з розных вёсак раёна. Таму і ўзнікла ідэя стварыць інтэрактыўную выставу народнага побыту, тым больш, што ёсць і памяшканне – бабуліна хата ў пасёлку Халмы Маркавіцкага сельсавета.**

Як прызнаецца Віктар Шыпкоў, усё пачалося яшчэ са школы, калі ён уваходзіў у склад фальклорнага калектыву “Чарнабрыўцы”. Пад кіраўніцтвам настаўніка Рыгора Басава ён азнаёміўся з прынцыпамі збірання, апісання і захоўвання старажытных рэчаў і нематэрыяльнай спадчыны: яшчэ ў юнацкія гады Віктар Шыпкоў удзельнічаў у адраджэнні старажытнага абраду “Ваджэнне Сулы”, які некалькі гадоў назад быў унесены ў спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.




*— Зараз мы збіраем дакументы для надання такога ж статусу яшчэ адной старажытнай традыцыі Маркавіч — каляднаму абраду “Звязда”,* — расказвае Віктар Шыпкоў. — *Штогод на свята Нараджэння Хрыстова хлопцы і дзяўчаты з зоркай, у цэнтры якой знаходзіцца ікона “Ражаства” ў вянку і ад якой адыходзіць восем “праменняў”, упрыгожаных кветкамі, каляровымі і ззяючымі стужкамі, хадзілі з хаты ў хату і віншавалі аднавяскоўцаў, абвяшчаючы добрую навіну: Хрыстос нарадзіўся!*

Дапамогу фалькларысту-аматару па афармленні заяўкі і падрыхтоўцы дакументаў аказваюць навукоўцы Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны.

Вялізны пласт даследаванняў Віктара Шыпкова датычыцца матэрыяльнай спадчыны продкаў. Пачалося ўсё са старой ільняной кашулі і прабабчынай “кажушкі”, якія юнак знайшоў на гарышчы.




*— На аўчынным кажушку засталіся нават узоры, выкананыя ў тэхніцы, якая нагадвае вядомую выцінанку з паперы. Толькі тут майстры “прабівалі” наскрозь скуру і падкладвалі пад праёмы прыгожую тканіну, а вакол узору прышывалі асаблівым чынам каляровыя стужкі,* — дзеліцца стогадовымі сакрэтамі рамяства Віктар Шыпкоў. — *Такое прыгожае аздабленне было відаць здалёку. Мая прабабуля захацела пашыць верхняе зімняе адзенне светлага колеру, а яшчэ каля ўзору вышыць свае ініцыялы “КБ” — Ксенія Бяляева.*




Малады чалавек не толькі дбайна захаваў сямейную рэч, але і скапіраваў яе. Некаторыя матэрыялы прый-шлося замяніць іх сучаснымі аналагамі, але ж агульны выгляд і тэхніка выкання былі поўнасцю захаваны.

У “скарбонцы” аўтэнтычных рэчаў — дзясяткі рушнікоў, спадніц-“андаракаў”, камізэлек-“ушварак”, фартушкоў-“запасак”. Большасць з іх, асабліва адзенне, служыць узорам для “рэплікі”, як назваў Віктар Шыпкоў поўнае капіраванне — ад падбору тканіны да спосабаў кройкі, шыцця і вышыўкі. Пра гэта майстар можа расказваць доўга, і часта ў яго гаворцы мільгаюць цікавыя слоўцы, якімі раней называлі спецыяльныя швы, напрыклад, “вузельцы”, “капейка” альбо “верхаблудзік”. Апошні так назвалі, бо бачныя ніткі былі толькі звонку адзення.




Віктар Шыпкоў самастойна асвоіў некалькі відаў рамяства — пашыў верхняга адзення, жаночых і мужчынскіх “строяў”-касцюмаў, аздабленне вышыў-кай і стужкамі, пляценне паясоў і ткацтва. Дарэчы, у майстра захоўваецца ўнікальнае “трыа” — тры ручнікі з адным узорам, выкананым у рознай тэхніцы.

— *Самы старажытны — тканы,* — тлумачыць майстар. — *На пазнейшых узоры “калодзеж” і “зоркі” ўжо былі вышыты крыжыкам. Дарэчы, вышыўка — вельмі цікавая вобласць для даследавання. Напрыклад, даўней для вяселля і пахавання сарочкі вышывалі “белым па беламу”, гэта пазней прыйшла мода на сарочкі “ў кветкі”.*




Заўтра, 22 снежня, у Мінску адкрываецца вялізная тэматычная выстава “Калядныя ўзоры” беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, на якой будуць прадстаўлены і работы Віктара Шыпкова.

Застаецца дабавіць, што планамерная праца да даследаванні народнай спадчыны прывяла аматара-этнографа і фальклрыста да думкі аб стварэнні інтэрактыўнай выставы ў вясковай хаце. Тут можна будзе апрануць на сябе строй, сфатаграфавацца, патанчыць пад гармонік і акунуцца ў побыт нашых продкаў.

**Ірына ГРАМЫКА. Фота Дар’і КАЙМОВіЧ**

**https://sozhnews.by**